# БЕЛАРУСКАЯ ЭМІГРАЦЫЯ І ДАСЛЕДАВАННЕ ПЫТАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*А.С.Ляднёва, БГЭУ*

Складаны шлях у сваім станаўленні і развіцці як нацыі прайшоў на працягу вякоў беларускі народ. Амаль да XX стагоддзя за Беларуссю не прызнавалася права мець сваю гісторыю, не існавала канцэпцыі аб'ектыўнага аналіза гісторычнай мінуўшчыны. У савецкі час беларускія навукоўцы знаходзіліся пад гнётам афіцыйнай ідеалогіі, якая адмаўляла існаванне дзяржаўнасці Беларусі ў эпоху сярэднявечча, выводзячы яе ад Кастрычніцкай рэвалюцыі і устанаўлення савецкай улады. З навуковага абароту былі выключаны працы беларускіх дзеячоў нацыянальнага адраджэння – П.Крэчэўскага, А.Луцкевіча, А.Цвікевіча, К.Езавітава. Я.Варонка, інш., якія пачатак беларускай дзяржаўнасці вялі ад Полацкага, Турава-Пінскага і іншых княстваў, а таксама з Вялікага княства Літоўскага. Толькі ў замежжы даследчыкі маглі незалежна ад палітычнай кан'юнктуры выкладаць свое погляды праз дзейнасць нацыянальных арганізацый і цэнтраў кнігавыдання.

Беларуская дыяспара склалася ў выніку масавай эміграцыі на мяжы XIX-XX стагоддзяў, у міжваенны перыяд, пасля другой сусветнай вайны і з пачаткам перабудовы ў Савецкім Саюзе. Але толькі пасляваенная і ў некаторай ступені сучасная хвалі прадстаўлены інтэлектуальнымі сіламі і высокім узроўнем нацыянальнай свядомасці. Значнай адметнасцю у навуковым жыцці пасляваеннай эмігранцкай хвалі з'яўляецца ўзнікненне у 50-я гады XX ст. ў Паўночнай Амерыцы, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстраліі шэрага беларускіх навукова-культурных цэнтраў, члены якіх друкавалі працы па гісторыі, у тым ліку закранаючыя пытанні паходжання беларускай нацыі, станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Навуковой працай, подрыхтоўкай да друку беларускай навуковой спадчыны займаліся Беларускі інстытут навукі і мастацтва ў Нью-Йорку і ў Таронта, Крывіцкае (беларускае) навуковае таварыства Ф.Скарыны, Фундацыя імя Крэчэўскага, Фонд імя Льва Сапегі, Фонд імя Любачкі, Беларускае культурна-мастацкае і навуковае таварыства ў Саўт-Рыверы, Англа-беларускае таварыства ў Лондане, Інстытут беларусаведы ў Ляймене (Германія). З сярэдзіны 50-х гадоў у Інстытуце па вывучэнню СССР дзейнічала беларуская секцыя, супрацоўнікі якой друкаваліся ў "Беларускім зборніку" (з 1954 па 1959 гг. выйшла 8 нумароў). Беларускія праблемы закраналіся і ў некаторых іншых калектыўных выданнях гэтага інстытута. Значная роля ў распаўсюджванні ведаў па гісторыі і культуры Беларусі належыць і замежнай беларускай перыёдыцы – шматлікім часопісам і газетам, якія выходзілі ў краінах, куды з Германіі і Аўстрыі пасля заканчэння другой сусветнай вайны рассяляліся беларусы.

Свабодныя ад ідэалагічнага і палітычнага ўздзеяння, якой падвяргалася савецкая грамадская навука, замежныя беларускія навукоўцы выкладалі гісторыка-прававыя канцэпцыі, кіруючыся толькі нацыянальнымі інтарэсамі народа, які яны прадстаўлялі на чужыне. Такія аўтары як Ан.Адамовіч, Я.Станкевіч, В.Пануцэвіч, П.Урбан, Н.Недасек, В. Жук-Грышкевіч, А.Калубовіч у процівагу афіцыйным тэорыям адмаўлялі існаванне адзінай старажытнарускай народнасці, абгрунтоўвалі

нацыянальны характар Вялікага княства Літоўскага, паказалі гісторыю беларускага нацыянальнага адраджэння, утварэння і станаўлення БССР праз трагічныя лесы нацыянальных дзеячаў. Я.Запруднік ў 1969 г. абараніў доктарскую дысертацыю, прысвечаную барацьбе вакол беларускага пытання ў Дзяржаўнай думе. Ім жа напісаны энцыклапедычны раздзел "Беларусь і беларусы", кніга "Беларусь: на гістарычных скрыжаваннях". У працы "Беларуская дзяржаўнасць: артыкулы і бібліяграфія", выдадзенай на англійскай мове В. і З. Кіпелямі падрабязна разглядаюцца раннія этапы развіцця беларускага нацыянальнага руху на пачатку ХХ ст., што прывяло да абвяшчэння ў 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі.

З 1991 г. Беларусь з'яўляецца незалежнай дзяржавай і ў замежных навуковых і перыядычных выданнях пачалі друкавацца навукоўцы з Бацькаўчшыны, падаючы свае бачанне адбудовы беларускай дзяржаўнасці.